ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 25 (1175) 6 кастрычніка 1977 г. Цана 2 кап.

**4 кастрычніка ў сталіцы нашай Радзімы — горадзе-героі Маскве адкрылася нечарговая сёмая сесія Вярхоўнага Савета СССР, якая прыме новы Асноўны Закон дзяржавы.**

## ПАСЯДЖЭННЕ САВЕТА БДУ

**У канцы верасня ў БДУ адбылося пасяджэнне Савета, на якім з дакладам «Вынікі 1976-77 навучальнага года і задачы па ўдасканаленню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй» выступіў прарэктар БДУ па вучэбнай работе гуманітарных факультэтаў У. Р. Івашын.**

**Аб выкананні плана падрыхтоўкі спецыялістаў у 1976-77 навучальным годзе, выніках работы Дзяржаўных экзаменацыйных камісій і задачах па далейшаму павышэнню якасці выканання дыпломных работ і здачы дзяржаўных экзаменаў студэнтамі - выпускнікамі Савету далажыў начальнік вучэбнага аддзела В. С. Далгарукаў.**

# Інфармацыйнае паведамленне аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

3 кастрычніка 1977 г. адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Пленум заслухаў даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Старшыні Канстытуцыйнай камісіі тав. Брэжнева Л. І. «Аб праекце Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і выніках яго ўсенароднага абмеркавання».

Пленум ЦК прыняў па дакладу тав. Брэжнева Л. І. пастанову, якая публікуецца ў друку.

Пленум ЦК выбраў сакратара ЦК КПСС тав. Чарненку К. У. кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС.

Пленум ЦК выбраў члена ЦК КПСС тав. Кузняцова В. В. кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС.

Пленум ЦК перавёў з кандыдатаў у члены ЦК КПСС т.т. Дзмідзенку В. П., Кірычэнку Н. К., Плешакова П. С., Фаміных А. М.

На гэтым Пленум ЦК КПСС закончыў сваю работу.

# Навіны

Залы універсітэцкай бібліятэкі, як і заўсёды, сустракаюць чытача цікава падрыхтаванымі і з густам аформленымі тэматычнымі выстаўкамі. Адна з іх — «Самая яркая дэмакратыя на зямлі» — прысвячаецца абмеркаванню праекта новай Канстытуцыі СССР. Побач — выстаўка кніг, якія ўдастоены Ленінскай прэміі і Дзяржаўных прэмій — СССР, РСФСР і БССР. Тут прадстаўлены: «Сям'я Ульянавых» М. Шагінян, «Чалавек» Э. Межэлайціса, «А дні ідуць» П. Броўкі, «Людзі на балоце» І. Мележа, «Неабходнасць» М. Луконіна, «Радкі памяці» Зульфіі, «Хатынская аповесць» А. Адамовіча, «Дзівасіл» В. Палтаран і іншыя.

Дзень настаўніка адзначан спецыяльнай выстаўкай, дзе сабраны педагагічныя працы Н. К. Крупскай, А. С. Макаранкі, А. В. Луначарскага, В. А. Сухамлінскага і г. д. Далей—падборка кніг, прысвечаная 80-годдзю Луі Арагона, — французскага пісьменніка і грамадскага дзеяча. Увагу кожнага наведвальніка прыцягвае вітрына «Кнігі нашых выкладчыкаў», сярод якіх — «Уводзіны ў прыкладную сацыялогію» Г. П. Давідзюка, «Археалогія Беларусі» Э. М. Загарульскага, «Публіцыстыка, жанры, майстэрства» Б. В. Стральцова, «Лекцыі па матэматычнаму аналізу» Ю. С. Багданава, «Электронная тэорыя поўправаднікоў» І. І. Пятроўскага і іншыя.

* * *

**Як раз у тэрмін сабраліся камуністы гаспадарчай часткі на свой сход. У дзелавой абстаноўцы абмеркавалі яны пытанне аб гатоўнасці інтэрнатаў БДУ да новага навучальнага года.**

**З дакладам на сходзе выступіў дырэктар студэнцкага гарадка А. А. Гіруцкі. Затым выступілі: ліфцёр інтэрната № 8 Г. М. Васільчанка, начальнік аддзела эксплуатацыі С. М. Касячэнка, інжынер студэнцкага гарадка М. Н. Асіпенка, начальнік аддзела забеспячэння У. І. Тарасевіч, інжынер-энергетык С. С. Сапронаў, інжынер аддзела капітальнага рамонту С. А. Ерамееў.**

**Камуністы прынялі пастанову, у якой намецілі канкрэтныя мерапрыемствы па заканчэнню капітальнага рамонту інтэрнатаў №№ 4 і 6 і выбарачнага рамонту інтэрнатаў №№ 3 і 7 да сярэдзіны кастрычніка.**

# АБ ПРАЕКЦЕ КАНСТЫТУЦЫІ (АСНОЎНАГА ЗАКОНА) САЮЗА САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК І ВЫНІКАХ ЯГО ЎСЕНАРОДНАГА АБМЕРКАВАННЯ

## Пастанова Пленума ЦК КПСС, прынятая 3 кастрычніка 1977 года

1. Цалкам і поўнасцю адобрыць даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Старшыні Канстытуцыйнай камісіі тав. Брэжнева Л. І. «Аб праекце Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і выніках яго ўсенароднага абмеркавання».

2. У асноўным адобрыць прадстаўлены Канстытуцыйнай камісіяй праект Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік з дапаўненнямі, удакладненнямі і папраўкамі, унесенымі ў яго па выніках усенароднага абмеркавання. Унесці праект Канстытуцыі на разгляд нечарговай сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР дзевятага склікання.

Даручыць Генеральнаму сакратару ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Старшыні Канстытуцыйнай камісіі тав. Брэжневу Л. І. выступіць з дакладам аб праекце Канстытуцыі і выніках яго ўсенароднага абмеркавання на сесіі Вярхоўнага Савета СССР.

3. Партыйным і савецкім органам, міністэрствам і ведамствам, прафсаюзным, камсамольскім і іншым грамадскім арганізацыям уважліва разгледзець усе паступіўшыя ў ходзе ўсенароднага абмеркавання праекта Канстытуцыі СССР прапановы і заўвагі працоўных па паляпшэнню работы па канкрэтных участках дзяржаўнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва і прыняць неабходныя меры да іх практычнай рэалізацыі.

## 60 КАСТРЫЧНІЦКАЯ ВАХТА БДУ

**БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА НА СВАІМ ПАСЯДЖЭННІ 15 ВЕРАСНЯ ПРЫНЯЛО ПАСТАНОВУ «АБ ХОДЗЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ЗА ПРАВА ПАДПІСАЦЬ РАПАРТ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА ЦК КПСС ДА 60-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА».** У пастанове, у прыватнасці, адзначаецца, што ў сувязі з падрыхтоўкай да юбілею і згодна з Пастановай V Пленума ЦК ВЛКСМ у камсамольскай арганізацыі БДУ разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва, сэнс якога заключаецца ў тым, каб прыцягнуць кожнага студэнта да актыўнай барацьбы за выкананне абавязацельстваў, узятых у гонар юбілею Кастрычніка. Па-камсамольску, па-дзелавому арганізаванае спаборніцтва ў нізавых камсамольскіх арганізацыях з'явілася дзейснай формай павышэння палітычнай актыўнасці, свядомасці студэнтаў. Яно садзейнічае паспяховаму выкананню кожным камсамольцам асабістага комплекснага плану «Вучымся камунізму, будуем камунізм!»

Усе пярвічныя камсамольскія арганізацыі універсітэта правялі пэўную работу па разгортванню спаборніцтва за падпісанне Рапарта ў кожнай групе. Ідэалагічным аддзелам камітэта камсамола быў распрацаваны і размножаны на факультэтах мандат пераможцы спаборніцтва. Разам з тым на бюро былі адзначаны асобныя недахопы.

25 чэрвеня закончыўся трэці этап, вынікі якога патрэбна падвесці ў кожнай групе да 25 кастрычніка. Бюро камітэта камсамола ў сувязі з гэтым звяртае ўвагу актываў груп на аб'ектыўны падыход да вызначэння пераможцы спаборніцтва, якому будзе прадастаўлена права ва ўрачыстай абстаноўцы падпісаць Рапарт.

Падпісанне гэтага дакумента павінна стаць важным палітычным мерапрыемствам, на якое трэба будзе запрасіць ветэранаў партыі і камсамола, герояў вайны і працы, камсамольскіх работнікаў. Усе пераможцы спаборніцтва будуць сфатаграфаваны ля Сцяга Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна і занесены ў Кнігу Славы камсамольскай арганізацыі.

Камітэтам камсамола факультэтаў трэба дзейсна, з першых дзён арганізаваць спаборніцтва сярод першакурснікаў, вызначыць пераможцаў па выніках іх удзелу ў сельгасработах.

Пастановай бюро ўсе камітэты камсамола факультэтаў абавязаны аформіць стэнды «Пераможцы спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка».

Прэс-цэнтр камітэта камсамола БДУ.

## Студэнты на палях Глыбоччыны

# Полымя спаборніцтва

«Полымя» — так называецца атрад філасофскага аддзялення гістарычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Назва такая невыпадковая. Ёй сугучна работа дружнага маналітнага калектыву. Члены атрада прынялі Зварот да ўсіх студэнтаў, якія працуюць у раёне. І ўвесь час на полі бурліла спаборніцтва за выкананне ўзятых абавязацельстваў. Для большай эфектыўнасці атрад разбілі на дзве групы. У першай — першакурснікі. У другой — студэнты старэйшых курсаў. Раздзяленне ўмоўнае. Тым не менш брыгадзір першакурснікаў Ігар Кульбацкі не без задавальнення заўважае аб поспеху яго групы. Вырваліся ўперад. Цяпер хай паспрабуюць нас дагнаць!

Старшакурснікі, якія «з'елі» не адзін пуд бульбы, вядома, і не думаюць уступаць сваім малодшым сябрам. Паднаціснулі, паказалі свой вопыт і скарацілі разрыў да кілаграмаў.

— Спаборніцтва ідзе з пераменным поспехам, — заўважае Уладзімір Міськевіч.— А гэта значыць, кожны стараецца, як можа.

У залік ідзе не толькі праца ў полі. У рабочым плане камсорга атрада Дзмітрыя Кузняцова канкрэтныя пункты аб аказанні дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, шэфства над школай, канцэрты, лекцыі. І калі размова зайшла пра самадзейнасць, то ўжо ў бліжэйшы тыдзень студэнты парадуюць сваім выступленнем калгаснікаў.

Вельмі хутка знайшлі кантакт з мясцовай моладдзю футбалісты «Полымя». Яны паспелі правесці з калгаснай футбольнай камандай сустрэчу і, як для гасцей, аказаліся не вельмі «сціплымі». Перамаглі з лікам 8:1. З выпадку такога бліскучага поспеху быў выпушчаны нават баявы лісток.

Нядаўна ў Мярэдскаўскай школе праходзіла спартыўнае свята. У ім прынялі ўдзел і спартсмены «Полымя». Студэнты і школьнікі прывялі ў парадак пляцоўкі, падрыхтавалі спартыўны інвентар. Студэнт Уладзімір Люкевіч прачытаў школьнікам лекцыі пра спорт.

Ніхто не астаўся ў баку ад грамадскіх спраў. І як трапна сказаў першакурснік Леанід Свярдлоў, — у кожнага ў душы агеньчык. Кожны знойдзе пасля працы цікавы для сябе занятак. Леанід, да прыкладу, расказваў вучням мясцовай школы пра ГДР, Людміла Юрчык— пра Мінск...

І ведаюць цяпер у калгасе: там, дзе студэнты—смех, жарты, песні. Там спорыцца праца.

**У. САУЛІЧ.**



Студэнцкі сельскагаспадарчы атрад «Журналіст-77», які складаўся са студэнтаў чацвёртага і другога курсаў факультэта журналістыкі, працаваў у гэтым годзе ў калгасе «Усход» Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці.

Ужо першыя працоўныя будні паказалі, што атрад можа працаваць добра. І таму, калі пастуціла прапанова вызваць на сацыялістычнае спаборніцтва два атрады фізічнага факультэта, якія працавалі ў гэтым жа калгасе, рабяты падтрымалі яе.

На агульным сходзе атрада было вырашана працаваць пад дэвізам «Кожны дзень — ударны». Рабяты з поўнай адказнасцю ўспрынялі ўскладзеную на іх справу, і кожны, хто працаваў у полі, выконваў па паўтары нормы ў дзень. 24 верасня ўборка бульбы з 35 га калгасных палёў была завершана.

Атрад не толькі ўдарна працаваў, але і праводзіў вялікую грамадска-палітычную работу. Рабяты далі два шэфскіх канцэрты калгаснікам, правялі работы па добраўпарад-

## ФОТАРЭПАРТАЖ

# КОЖНЫ ДЗЕНЬ—УДАРНЫ



## ПА СТУДЭНЦКУ, З АГЕНЬЧЫКАМ

**Амаль 200 студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта прыбылі ў саўгас «Докшыцкі» на дапамогу ў правядзенні ўборачных работ. Цёпла сустрэлі іх хлебаробы. Юнакоў і дзяўчат размясцілі ў брыгадах, што бліжэй да цэнтра гаспадаркі — у вёсках Якушава, Валодзькі і Літоўцы. Дырэкцыя, партком і прафком паклапаціліся аб забеспячэнні студэнтаў добрым харчаваннем: стравы рыхтаваліся ў Крулеўшчынскай і саўгаснай сталовых, па сабекошту.**

**На клопаты студэнты адказалі ўдарнай працай. Яны стварылі некалькі атрадаў і звенняў. Так, напрыклад, 8 юнакоў выказалі жаданне працаваць у будаўнічай брыгадзе, 13 студэнтак былі заняты ўборкай гародніны, астатніх раздзялілі на групы і пасылалі на копку бульбы.**

**Прымяняліся меры маральнага і матэрыяльнага заахвочвання. Атраду, які займаў першынство ў спаборніцтве, на другі дзень выдаваўся талон коштам 15 рублёў. Часта такія талоны атрымліваў атрад, які быў заняты ўборкай бульбы ў брыгадзе «Бабічы». 3 верасня ён выканаў заданне на 107,6 працэнты, а 4 верасня — на 102 працэнты. Заўважым, што 4 верасня была нядзеля, аднак моладзь працавала выдатна. І яшчэ. Трэба сказаць, што ў сувязі з неспрыяльнымі кліматычнымі ўмовамі ўраджай сёлета не надта высокі, таму выкананне нормы патрабавала асаблівага напружання.**

**У канцы ўборкі, пры падвядзенні агульных вынікаў, атрадам-пераможцам уручаны граматы, падарункі, грашовыя прэміі.**

**Ф. КАЛБАСІЧ,**
**эканаміст саўгаса.**

# НАША ПРАЦА—РАДЗІМЕ

У першыя дні верасня ўсталявалася цёплае сонечнае надвор'е. Кожную раніцу велічны чырвоны дыск асенняга сонца хутка зганяў з палёў і сенажацяў бялявую смугу туманаў. Дзесьці за ўзгоркам натужна і аднастайна слаўся па полі рокат трактара.

Вось у адну такую сонечную светлую раніцу і з'явіліся на докшыцкіх бульбяных палях студэнты — першакурснікі беларускага аддзялення філфака. Агледзелі поле, удакладнілі арганізацыю работы і, не марудзячы ні хвіліны, дружна ўзяліся за працу. Прыемна было назіраць, як юнакі і дзяўчаты, якія некалькі дзён таму назад вытрымалі сур'ёзныя конкурсныя экзамены, мала знаёмыя паміж сабою, аб'яднаны адзінай мэтай — зберагчы, сабраць да апошняй бульбінкі вырашчаны ўраджай «другога хлеба». Прыемна было ўсведамляць, як на вачах згуртоўваецца моцны студэнцкі калектыў. І зусім не страшна, што бязлітасна пячэ сонца, пыл пудрыць твар і адзенне, адчуваецца лёгкая стома ў целе — настрой уздымаецца ад усведамлення таго, што слаўна, добрасумленна папрацавалі — норма ёсць! Выдатна спраўляліся са сваімі абавязкамі Аляксандр Сяньkевіч і Мікола Чарнабай. Чуюцца распарадчыя галасы стараст трэцяй і чацвёртай груп Мікалая Русакевіча і Ромы Шалкоўскай. Кіпіць работа ў руках Іры Яцкевіч, Аляксандра Таранды, Лены Турскай, Эдуарда Мікялевіча, Ядзвігі Поляк. Нясціхна гудзе бульбакапалка, павольна адыходзяць да месца буртавання бульбы трактарныя прычэпы.

А калі неўзабаве наступіла доўгае пахаладанне з пранізлівымі вятрамі і дажджамі, студэнты супроцьпаставілі восеньскай непагадзі згуртаванасць і зладжанасць у рабоце, вытрымку і працавітасць. Былі на полі штодзённа і без выхадных, нягледзячы на дрэннае надвор'е. Не выпадкова група мае на сваім рахунку сем прэміяльных талонаў, устаноўленых рабачкомам і дырэкцыяй саўгаса за лепшы вынік пры выкананні нормы на ўборцы бульбы. Хутка прыйшла радасная вестка з раённага цэнтра: аб'яднаная вытворчая група нашых студэнтаў у складзе 33 чалавек, што працуе ў саўгасе «Докшыцкі», заняла першае месца ў раёне па колькасці выкапанай бульбы на аднаго чалавека. Гэтае паведамленне ў раённай газеце «Шлях Леніна» натхніла студэнтаў на новыя працоўныя поспехі.

Але не толькі працай на полі жылі філолагі-першакурснікі. Яны наведвалі бібліятэку і кіно, у Круляўшчызненскай сярэдняй школе для вучняў і настаўнікаў далі канцэрт мастацкай самадзейнасці, выпусцілі некалькі нумароў газеты «Шурпінка». Ва ўсіх групах былі праведзены камсамольскія выбарчыя сходы, на якіх былі выбраны групкамсоргі і члены групавых камсамольскіх бюро.

Кіраўніцтва саўгаса вельмі цёпла адзываецца пра нашых студэнтаў. З упэўненасцю можна сказаць, што сваёй працавітасцю, сціпласцю ў жыцці і быце студэнты першага курса філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна заваявалі павагу і добры аўтарытэт у саўгасе, ударна, па-камсамольску памнажаюць багацце нашай Радзімы.

**Я. КАМАРОЎСКІ,**
**дацэнт, кіраўнік аб'яднанай вытворчай групы студэнтаў І курса беларускага аддзялення філфака.**
**Фота аўтара.**



каванню помніка воінам—жыхарам калгаса, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, дапамаглі іх сем'ям.

Аб подзвігу студэнта Аршанскага індустрыяльна-педагагічнага вучылішча Міхаіла Мароза, які цаной свайго жыцця выратаваў таварышаў ад узрыву снарада, што папаў на транспарцёр бульбаўборачнага камбайна, байцы атрада «Журналіст-77» даведаліся ў час работы на полі. У гэты ж дзень на камсамольскім сходзе рабяты выршылі залічыць героя ў свой атрад, а грошы, заробленыя на яго імя, пералічыць на збудаванне помніка Міхаілу Марозу.

Пасля гэтага студэнты-журналісты працавалі з падвоенай энергіяй. Атрад двойчы прэміраваўся праўленнем калгаса за якасць і эфектыўнасць работы. Тон у працы задавалі А. Тарпачоў, В. Шаліўская, В. Кукса, Г. Сідаровіч, І. Кучко, З. Русаковіч, П. Дарашчонак, А. Яндоўскі.

**В. ДРАЧОЎ.**
**Фота аўтара.**





**На здымках:**
Разгрузку бульбы вядуць П. Дарашчонак і А. Яндоўскі.
На работу...
Адна за адной пакідалі поле нагружаныя бульбай машыны. Гэтую машыну адпраўляе Галіна Сідаровіч.
Я так даўно не бачыў маці...

# ЗЛАДЖАНЫ РЫТМ

РЭПАРТАЖ

Нарэшце ўсталявалася сухое і цёплае надвор'е. Гэта радуе хлебаробаў. Яны імкнуцца выкарыстаць кожны дзень з максімальнай аддачай. Працаўнікі палёў племсаўгаса «Азярцы» Глыбоцкага раёна заканчваюць жніво, сяўбу азімых і арганізавана вядуць уборку бульбы.

З дырэктарам гаспадаркі Сяргеем Міхайлавічам Мядзведскім, сакратаром партыйнай арганізацыі Анатолем Дзмітрыевічам Маскалёвым і галоўным аграномам Міхаілам Васільевічам Пашкевічам едзем у другі вытворчы ўчастак, дзе ўжо каля тыдня працуюць не толькі мясцовыя рабочыя, а і студэнты БДУ імя Леніна.

Дружны і працавіты народ студэнты. Ёсць у іх і кіраўнік групы, і камандзір атрада, і камісар, якія працуюць нароўні з астатнімі. Можа, толькі клопатаў у іх больш: каб і сытна было сябрам, і цёпла...

— На сваё вясковае жыццё, на мой погляд, ніхто не крыўдуе, — падхоплівае размову парторг. — Размеркавалі студэнтаў па кватэрах, прадаставілі ў іх распараджэнне памяшканні для сталовай і адпачынку. Ёсць дзе і ў валейбол пагуляць, і патанцаваць.

— Мы не першы раз дапамагаем сельскім працаўнікам на ўборцы, а такой гасціннасці і клопатаў, якімі акружылі нас у племсаўгасе, яшчэ не бачылі. — І камісар атрада Пётр Трубчык кліча на хвілінку да нас камандзіра атрада Аляксандра Уліцёнка.

— Работай задаволены. Без справы не бываем — мясцовыя механізатары, хаця б, да прыкладу, наш Фёдар Веняміктавіч Шубнік, працуюць на бульбакапалцы так, што ледзь упраўляемся за імі. Задаволены ўсім. Праўда, мы адмовіліся ад абедаў са сталовай: дае ведаць старая студэнцкая прывычка, якая прыжылася ў будаўнічых атрадах, — рыхтаваць ежу самім. Бульбу, бурачкі дырэкцыя адпускае бясплатна, а хлеб, мяса і малако таксама каштуюць тут не вельмі дорага. Сорамна працаваць абы-як.

І камандзір расказвае далей. З яго расказу бачна, што дзённую норму кожны член атрада выконвае і перавыконвае. Так, напрыклад, пры ўраджайнасці да 150 цэнтнераў клубняў з гектара аднаму чалавеку патрэбна падабраць іх за бульбакапалкай 800 кілаграмаў. А падбіраюць хлопцы і дзяўчаты па 900 і больш. Асабліва вызначыліся ў першыя дні працы Наташа Філоненка, Сяргей Сасім, Рэгіна Пятровіч, Дзіма Беленькі.

Студэнты актыўна спаборнічаюць паміж сабой. Рабяты гэтага атрада выклікалі на спаборніцтва юнакоў і дзяўчат чацвёртага курса юрыдычнага факультэта, якія працуюць на суседнім, чацвёртым участку. І, трэба сказаць, першынствуюць. І яшчэ адну немалаважную дэталь хацелася б падкрэсліць: студэнты факультэта журналістыкі выступаюць перад насельніцтвам з дакладамі, канцэртамі мастацкай самадзейнасці.

А зараз зноў вернемся да размовы з кіраўнікамі гаспадаркі. Вось што з яе высвятляецца. Неабходна ўбраць 330 гектараў бульбы да першага кастрычніка, прадаць яе дзяржаве 1000 тон, у тым ліку 250 тон братняй Грузіі на насенне. А яно павінна адпавядаць пасяўным стандартам. Таму капаюць тут раннія і сярэднеспелыя сарты. Перабіраць клубні такіх сартоў мяркуюць уручную: кожны клубень пераглядзець трэба, каб ён не толькі падыходзіў па памеру, але яшчэ і быў абсалютна здаровы. На бульбасартавальным пункце гэтага зрабіць нельга. Два сартавальныя пункты будуць уключаны ў работу крыху пазней, калі пачнецца ўборка клубняў сартоў, якія пойдуць на корм жывёле або тэхнічныя мэты.

Пакуль што ў племсаўгасе штодзённа ўбіраюць па 8—10 гектараў бульбы, а будзе ўбірацца па 15. На прыгодныя для камбайнавання плошчы хутка выйдуць бульбакамбайны. Вызваліцца ад уборкі саломы тэхніка, і з бульбакапалкамі будзе занята не восем трактараў, а ўдвая больш. На дапамогу вяскоўцам і студэнтам прыйдуць школьнікі дзесяцігодкі.

Пашкодзіла ўраджай бульбы сёлетняе мокрае лета, але ён не такі ўжо і нізкі: па 150 цэнтнераў клубняў дае ў сярэднім кожны гектар.

**А. САЛТУК.**

# НА ПАЛЯХ САЎГАСА «ВЕРАЦЕІ»

118 студэнтаў геаграфічнага факультэта БДУ ў складзе 5 атрадаў былі заняты на ўборцы кармавых буракоў, бульбы і будаўніцтве кароўніка ў саўгасе «Верацеі» Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці.

У першыя дні работы ў кожным атрадзе адбыліся камсамольскія сходы, выбраны камсоргі (камісары), рэдакцыйная калегія, фізоргі, камандзіры атрадаў. Асаблівая ўвага студэнтаў была звернута на захаванне тэхнікі бяспекі на ўборачных работах.

У плане палітыка-выхаваўчай работы вялікая ўвага надзялялася арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва паміж атрадамі і сярод звенняў унутры атрада. Вынікі работы атрадаў штодзень асвятляліся ў насценным друку. Кожны атрад рыхтаваў мастацкую самадзейнасць. У гадзіны адпачынку ўнутры атрадаў і паміж атрадамі праводзіліся бліц-турніры па мініфутболу, валейболу, шашкам; былі арганізаваны таварыскія сустрэчы з вучнямі мясцовай сярэдняй школы. Студэнты прачыталі лекцыі аб Белдзяржуніверсітэце і на спартыўную тэматыку для вучняў школы і працоўных саўгаса «Верацеі». У планах работы атрадаў прадугледжвалася аказанне дапамогі ветэранам вайны і працы па ўборцы ўраджаю з асабістых участкаў.

У першыя дні работы былі і цяжкасці, звязаныя са спецыфікай работы, арганізацыяй харчавання і быту студэнтаў. Дзейсную дапамогу ў ліквідаванні гэтых цяжкасцяў аказалі дырэкцыя саўгаса, галоўны агравом, а таксама парторг Галіна Уладзіміраўна Буцько.

Належыць адзначыць лепшых студэнтаў І курса геафака, якія прымалі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці атрада і дабіліся высокай прадукцыйнасці працы на палях саўгаса «Верацеі». Гэта Алег Смарчкоў, Іван Амецінскі, Ігар Шапалін, Аляксандр Аляксеенка, Тамара Чарнякова, Валянціна Сеўрук, Міхаіл Ісачанка, Аляксей Сабалеўскі, Кацярына Нікалаенка, Таццяна Пучко, Светлана Гайлевіч, Леанід Мельніковіч, Вольга Сідаровіч, Алена Сідаровіч, Віктар Казак.

Добра працавала і будаўнічая брыгада, якую узначальваў студэнт І курса геафака Анатоль Новік.

**С. ІШЧАНКА,**
**В. АКІМАЎ,**
**Н. ЛОПУХ,**
**кіраўнікі атрада.**

# АЦЭНКА—«ВЫДАТНА»

**Добра працавалі ў нашым калгасе «Праўда» студэнты фізічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Асабліва вызначыўся атрад, якім кіраваў В. Кісялёў. Кожны з 18 членаў яго падбіраў за бульбакапалкай у сярэднім штодзень па 1200 — 1400 кілаграмаў клубняў. Усе працуюць старанна, нормы перавыконваюць.**

**Якасць работы добрая. А таму і збор клубняў з гектара высокі — да 140 цэнтнераў.**

**Г. ДУБАНЕВІЧ.**

# ПРАЦЫ—КАМСАМОЛЬСКУЮ ГАРАНТЫЮ

Другі год працуюць у Глыбоцкім раёне на ўборцы бульбы студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Мы, студэнты аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта, капалі бульбу ў калгасе імя Калініна. Калгаснікі, кіраўнікі гаспадаркі, мясцовыя жыхары сустрэлі нас гасцінна, забяспечылі ўсім неабходным для работы і адпачынку. Наш абавязак мы зразумелі так — працаваць плённа, з поўнай аддачай.

Пачаткам працоўнай вахты ў гонар юбілею Радзімы для нас, студэнтаў, з'явілася ўборка бульбы летась тут, на Глыбоцкай зямлі. Прайшоў год. Мы паспяхова вучыліся, актыўна ўдзельнічалі ў трэцім працоўным семестры.

І вось зноў — праца ў калгасе.

Мы імкнуліся прыкласці максімум намаганняў для паспяховага вырашэння пастаўленых перад намі задач, працаваць з высокай прадукцыйнасцю, забяспечыць выдатную якасць працы, не пакінуць у полі ніводнага клубня. Наш дэвіз: працы — студэнцкую гарантыю.

Другое, не менш важнае патрабаванне да нас, студэнтаў: актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці раёна. Мы прапагандавалі сярод насельніцтва праект новай Канстытуцыі СССР, расказвалі аб вялікіх дасягненнях Краіны Саветаў за 60 год Савецкай улады.

Плённая, старанная праца на палях Глыбоцкага раёна, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці гаспадарак — дастойны падарунак студэнтаў юбілею Вялікага Кастрычніка, шчырае адабрэнне палажэнняў праекта Асноўнага Закона краіны.

**Л. ЮРЧЫК,**
**камандзір.**
**М. КАНДРЫЧЫН,**
**камісар.**

# ГАЗЕТУ, ЧАСОПІС — КОЖНАМУ

Трэцяе кастрычніка. Першы дзень заняткаў пасля напружанай працы ў студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадах. Упершыню студэнтамі заходзяць у аўдыторыю першакурснікі. Пачынаецца барацьба за веды. А яшчэ ў гэты дзень пачынаецца падпіска на перыядычныя выданні і часопісы. Ты не забыў аб гэтым, студэнт БДУ?

Твой абавязак камсамольца або маладога камуніста — актыўна ўключыцца ў падпісную кампанію, выпісаць камсамольскую газету або часопіс. Цябе, падпісчыка, чакаюць грамадска-палітычныя выданні ЦК ВЛКСМ і ЦК ЛКСМБ — газеты «Комсомольская правда», «Знамя юности», «Чырвоная змена» часопісы «Молодой коммунист», «Комсомольская жизнь» і «Маладосць».

Ты, сённяшні студэнт, праз адзін або пяць год выйдзеш са сцен нашага універсітэта, станеш кіраўніком вытворчасці, настаўнікам у школе, будзеш працаваць у многіх галінах народнай гаспадаркі, навукі, культуры. У аўдыторыях ты атрымаеш неабходныя веды па выбранай спецыяльнасці — у гэтым табе дапаможа шматлікі калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Але каб стаць спецыялістам, адпавядаючым патрабаванням нашага часу, табе неабходна яшчэ прайсці палітычную падрыхтоўку, мець шырокі палітычны кругагляд. Твае надзейныя і паўсядзённыя памочнікі ў гэтым — газеты і часопісы.

На іх старонках ты заўсёды знойдзеш адказ на хвалюючае цябе пытанне, даведаешся аб справах і жыцці тваіх равеснікаў у нашай краіне і за яе межамі. зможаш пазнаёміцца з тым, што цікавіць цябе ў той ці іншай сферы жыцця, сачыць за падзеямі ў свеце, як кажуць, трымаць руку на пульсе часу. Памятай, студэнт БДУ, што праз некаторы час табе самому давядзеца быць выхавацелем, а ў гэтай справе — справе выхавання моладзі—велізарнае значэнне мае далучэнне яе да рэгулярнага чытання грамадска-палітычных выданняў партыі і камсамола. Прыклад сапраўднай, карыснай дружбы з газетай павінен падаць сёння ты, таварыш студэнт. Камітэт камсамола універсітэта верыць у тваю высокую палітычную свядомасць і спадзяецца, што ты не толькі выпішаш адно-два камсамольска - маладзёжныя выданні, але і станеш актыўным грамадскім арганізатарам падпіскі.

За справу, дарагі таварыш!




## У МУЗЕІ, ТЭАТРЫ, КІНО...

* У час экскурсіі вакол экскурсавода не тоўпяцца, перад карцінай стаяць так, каб усім было бачна.

* Публічная дэманстрацыя захаплення або незадавальнення недарэчы. Наша непрыйманне можа быць проста вынікам некампетэнтнасці ў гэтай галіне. Гаворачы «лухта» ці «мазня нейкая», мы характарызуем не столькі сам твор, колькі сваё суб'ектыўнае ўспрыйманне яго, якое можа быць і памылковым. Таму выказваць свае ацэнкі належыць больш сціпла.

* У фае тэатра звычайна пад руку не ходзяць. Падтрымліваць пад руку можна, ідучы па лесвіцы.

* Першым да свайго месца праходзіць мужчына.

* Звычайна спадарожнік апускае і прытрымлівае адкідное сядзенне крэсла, на якое садзіцца яго спадарожніца.

* На абодва падлакотнікі крэсла не абапіраюцца: не трэба забываць аб зручнасцях суседа.

* Праз галовы тых, хто сядзіць, размовы не вядуць.

## Ад А да Я. Этыкет

(Працяг).

**Ветлівасць.** Да XVI стагоддзя «вежа» азначала «знаток». Ветлівы — той, хто ведае, як трымаць сябе, дзейнічаючы ў адпаведнасці з абставінамі. Змяняюцца абставіны, і ветлівасць змяняе адценні. Карэктнасць — некалькі падкрэсленая, афіцыйная, часам сухаватая ветлівасць. Пачцівасць — ветлівасць у адносінах да старэйшых, жанчын. Ласкавасць — ветлівасць з выказаным імкненнем быць прыемным і карысным. Далікатнасць — ветлівасць у спалучэнні з асаблівай мяккасцю і тонкасцю ў разуменні іншых. Але ва ўсіх выпадках аснова ветлівасці — павага да людзей.

Ці трэба быць ветлівым з тымі, каго мы не паважаем? Трэба. Халодна ветлівым, нават пагардліва ветлівым, але ветлівым абавязкова. Таму што ветлівасць — гэта не толькі павага да іншых, але і пачуццё ўласнай годнасці.

**Візіты.** Бываюць дзелавыя, сяброўскія, афіцыйныя, а таксама нечаканыя, дакучныя, зацягнуўшыяся.

Візіт без запрашэння магчымы, калі гаспадары — блізкія вам людзі і ёсць ўпэўненасць, што зносіны з вамі для іх прыемней любога іншага правядзення часу.

Вас запрасілі. Запрашэнне альбо прымаецца, альбо ветліва адхіляецца, але падзяка — абавязкова.

Мы прыходзім роўна ў назначаны тэрмін. Калі не можам прыйсці, загадзя паведамляем і прыносім прабачэнні. Гаспадары не пакрыўдзяцца, калі мы не прывядзем з сабою ўсіх сваіх знаёмых, дзяцей і сабачку.

**Віно.** Адны гавораць — «зялёны змій», другія — «ісціна ў віне». Усё залежыць не ад віна — ад чалавека. Галоўнае ж — мера, таму што «сумна з разважнай істоты пераўтварыцца ў дурака, а потым і ў жывёліну» (Шэкспір).

**Высокародства.** У чатыры гады — гэта руль новага веласіпеда, працягнуты сябру: «Ты першы!». У чатырнаццаць — баксёрская стойка перад вялізным бамбізай: «Альбо ты аддасі мяч малым і перастанеш лаяцца, альбо...» У дваццаць чатыры: «Заслугі бацькі — гэта заслугі бацькі... Ну і што ж, што ён прасіў... Я як усе. Паеду!» У сорак чатыры...

Але дастаткова прыкладаў. Формы высокародства розныя, а сутнасць адна — вялікадушнасць, бясстрашнасць, сумленнасць, прамата, бескарыслівасць. Усё што магу — для іншых. Магчыма, гэта і ёсць формула высокародства.

## Бібліятэка рыхтуе падарунак

Да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка ў бібліятэцы БДУ мяркуецца адкрыць новы аддзел— каштоўных і рэдкіх кніг. Сфарміраваны фонд аддзела, у яго ўвайшлі такія, напрыклад, каштоўныя, арыгінальныя выданні, як «Арифметика» Магніцкага, часопіс «Отечественные записки», газета «Правда» 1912 года, прыжыццёвыя выданні твораў Льва Талстога і іншыя.

Рыхтуюцца экспазіцыі аддзела. Іх складуць прыжыццёвыя выданні твораў У. І. Леніна, кнігі выдання першых гадоў Савецкай улады, дакументы.

Аддзел каштоўных і рэдкіх кніг арыентаваны, у асноўным, на студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў гістарычнага факультэта і факультэта журналістыкі, але карыстацца кнігамі зможа любы член калектыву універсітэта. Наведванне аддзела плануецца ў выглядзе экскурсій групамі студэнтаў разам з куратарам. Навуковым супрацоўнікам БДУ будзе прадастаўлена магчымасць працаваць з літаратурай.

## Лісток ДАІ

# Дзеці, бацькі, дарога

У гэты дзень усё было як звычайна, толькі дождж да парывісты вецер прымушалі пешаходаў раскрываць парасоны, узнімаць каўняры і спяшацца. Наперадзе мяне са двара выйшаў хлопчык гадоў шасці, і перабегшы праезджую частку вуліцы, накіраваўся да аўтобуснага прыпынку.

— Дзесці паблізу павінны быць бацькі, — падумала я.

На нейкі час малы знік з маіх вачэй, але ў аўтобусе мы зноў аказаліся побач. Карапуз незалежна стаяў ля кабіны вадзіцеля і ўважліва лічыў прыпынкі, а потым заспяшаўся да выхаду. Вось так мы з ім і пазнаёміліся. Праўда, ён вельмі неахвотна назваў сваё імя і прозвішча, не разумеючы, чаго ад яго хоча незнаёмая жанчына ў міліцэйскай форме.

Аказалася, што Саша Маліноўскі, выхаванец 82-га дзіцячага саду, ехаў дадому на аўтобусе, таму што забыў вельмі патрэбную яму цацку...

Хто дазволіў паездку? На гэтае пытанне гора-пасажыр адказаць не змог. Дома, у прысутнасці маці, адбылася грунтоўная размова на тэму бяспекі дарожнага руху. Выявілася, што бацька Сашы, спяшаючыся на работу, давёў дзіця да вугла дому, за якім знаходзіцца дзіцячы сад, спадзяючыся, што далей дарогу сын знойдзе сам. Трох хвілін, на працягу якіх Саша знаходзіўся адзін, было дастаткова для таго, каб прыняць «самастойнае» рашэнне. Хлопчык павярнуў назад, да прыпынку.

На гэты раз нічога сур'ёзнага не адбылося, але ж часам бывае інакш... За 7 месяцаў гэтага года ў горадзе адбылося 45 дарожна-транспартных выпадкаў з удзелам дзяцей. Пяцёра загінулі, многія атрымалі цяжкія параненні.

Так, чатырохгадовы Саша Клышко раптоўна выбег на праезджую частку вуліцы Будзёнага наперадзе стаячага тралейбуса і быў збіты аўтамашынай, якая рухалася ў другім радзе; выхаванец 150-га дзіцячага саду Дзіма Аксёнаў, які катаўся на веласіпедзе ў раёне бульвара Шаўчэнкі, сутыкнуўся з тралейбусам; пад колы машыны папаў Вася Брэжнеў, які скатваўся з горкі, загарнуўшыся ў картонную каробку!

Так, найчасцей за ўсё такія выпадкі здараюцца з-за парушэнняў дзецьмі правілаў руху на дарогах. Прычына трагедый? Безнагляднасць, адсутнасць у дзяцей навыкаў правільных паводзін на вуліцы. І за гэта нельга не папракнуць бацькоў, педагогаў. Купляючы сыну або дачцы веласіпед, бацькам неабходна набыць і Правілы дарожнага руху, а на сямейным савеце прыняць «экзамен» ад юнага веласіпедзіста. Неабходна таксама памятаць, што кіраваць веласіпедам па дарогах дазваляецца дзецям не маладзей 14 гадоў. Дзіця без нагляду — гэта надзвычайны выпадак. Толькі так павінны расцэньваць дарослыя факт знаходжання дзяцей на праезджай частцы вуліц і дарог нашага горада. Вельмі важна разгарнуць адпаведную тлумачальную работу на прадпрыемствах, ва ўстановах, дзе працуюць бацькі. Гэта таксама робіцца не ўсюды. Супрацоўнікі ДАІ пабывалі на заводах, фабрыках, у многіх арганізацыях горада. Аказалася, на заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, маторным, вытворчым аб'яднанні «Бальшавік» нездавальняюча ідуць справы з прапагандай правілаў дарожнага руху. Ці трэба пасля гэтага абвінавачваць толькі саміх дзяцей?

**В. СЕМЯНЮК,**
**супрацоўнік ДАІ**
**УУС Мінгарвыканкома.**

## ПАВАЖАНЫЯ СТУДЭНТЫ!

У новым навучальным годзе Вас запрашае факультэт грамадскіх прафесій на аддзяленні:

лектарска - прапагандысцкае,

рэжысёрскае,

харэаграфічнае,

кіраўнікоў аркестраў народных інструментаў,

грамадскіх суддзяў і інструктараў па спорту,

фотакарэспандэнтаў,

камсамольскіх арганізатараў.

**Заявы прымаюцца ў дэканаце факультэта грамадскіх прафесій (пакой 209 галоўнага корпуса) па рэкамендацыях камсамольскіх арганізацый.**

## ФОТАПАЛЯВАННЕ



Восеньскія матывы.

Фотаэцюд В. ДРАЧОВА.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 04432 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. № 1555.